УЧАСТНИКИ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

19 ноября 2013 г. Гомельские ВЕДОМОСТИ

70 лет со дня освобождения Гомеля

«Воевал, отлетал, на смерть смотрел»

«Было страшно. Каждый вылет считал последним. Зачастую думал, что если поднимаю самолёт в небо, значит, не вернусь. И таких боевых вылетов у меня было 150», – вспоминает события 70-летней давности 90-летний ветеран Великой Отечественной войны Виктор Букин, который в ноябре 1943 года в воздухе над Гомелем выполнял стратегически важное задание незадолго до освобождения города.

Фото Анны ПАЩЕНКО, «ГВ».

Полк бомбардировщиков Б-25, среди которых был самолёт Виктора Петровича, поднялся с аэропорта под Житомиром, чтобы выполнить приказ – уничтожить железнодорожную станцию Гомеля. «Это нужно было сделать, чтобы к немецким войскам во время операции по освобождению города не смогло подойти подкрепление», – подчёркивает ветеран. До подхода к месту назначения полёт проходил спокойно. «Самое опасное для экипажа – это находиться на боевом курсе, – говорит бывший командир экипажа Виктор Букин. – Нельзя маневрировать, даже когда по тебе палят зенитки. Это необходимо для того, чтобы штурман мог прицелиться и сбросить бомбы. В это время большинство самолётов и сбивалось». Эта опасность и настигла наших лётчиков. Когда авиаполк вошёл в воздушное пространство над Гомелем, то попал в лучи прожекторов, и фашистские зенитчики заметили советские самолёты. «Вокруг нас начали рваться зенитные снаряды. Увернуться от них было невозможно, нужно было выдерживать скорость, высоту, курс, – рассказывает ветеран. – Один экипаж Б-25 немцы всё-таки сбили. Все ребята погибли». Остальным дойти до цели удалось, и самолёты открыли бомболюки. «На нашем самолёте, как и на всех остальных, было около двух тонн бомб, которые полетели на железнодорожную станцию. Пока их сбрасывали, на приборной панели мигала лампочка. Ждал лишь одного: когда она погаснет. Бомбёжка длилась минут пятнадцать. Слава Богу, что не сбили. Взглянув вниз, увидел огромные клубы огня. Вокзал горел жутким пламенем. А в городе в это время пожаров не было. Это я хорошо запомнил», – делится воспоминаниями собеседник. В итоге боевое задание по уничтожению железнодорожной станции с живой силой, вражескими эшелонами и военной техникой было выполнено.

За боевые заслуги теперь уже подполковник в отставке награждён орденами Славы и Красного Знамени, двумя орденами Отечественной войны и тремя Красной Звезды.

«Воевал, отлетал, на смерть смотрел», – так коротко говорит он о своей героической службе. Однажды под Ленинградом его самолёт даже был сбит, и экипажу из пяти человек пришлось прыгать с парашютами. Благо, что приземлились на своей территории.

После Великой Отечественной войны Виктор Букин ещё 17 лет летал на пассажирском самолёте Ан-24, работая в аэропорту Гомеля.

Дмитрий ЧЕРНЯВСКИЙ, «ГВ».

ПАМЯЦЬ

Знакаміты выпускнік

Аўдыторыі і калідоры корпуса № 2 ГДУ імя Ф. Скарыны памятаюць самага знакамітага яго студэнта – Героя Савецкага Саюза Барыса Калача. Барыс Філіпавіч заслугоўвае, каб кожны з нас ведаў аб ім як мага больш. Дадзены артыкул і мае на мэце дапамагчы ў гэтым.

27 верасня 1946 года Барыс Калач прыехаў у тагачасны педагагічны інстытут імя В. П. Чкалава і падаў дакументы для паступлення на гістарычны факультэт. У гэты ж дзень здаў тры экзамены і быў залічаны на першы курс. Толькі што скончылася Вялікая Айчынная вайна Савецкага Саюза з фашысцкай Германіяй і яе сатэлітамі. У гэтай вайне Барыс Калач прымаў актыўны ўдзел на партызанскім фронце, быў двойчы паранены, апошні раз – цяжка, з-за чаго стаў інвалідам Вялікай Айчыннай вайны III групы. За вучобу Барыс Філіпавіч узяўся гэтак жа актыўна, як і ваяваў. Гэта адзіны Герой Савецкага Саюза, які навучаўся ў нашым універсітэце і ўпісаў яркую старонку ў гісторыю сваёй альма-матар. Таму зараз кожны выкладчык, супрацоўнік, студэнт і аспірант ГДУ не можа не ганарыцца тым, што тут вучыўся з названай даты да 12 чэрвеня 1950 года Герой Савецкага Саюза Барыс Калач.

Будучы студэнт і выпускнік нашага педінстытута нарадзіўся 11 жніўня 1923 года каля станцыі і пазней раённага цэнтра Гарадня Чарнігаўскай вобласці ў сям'і селяніна ўкраінскай нацыянальнасці. Як піша ў аўтабіяграфіі сам Барыс Філіпавіч, з 1930 года ён вучыўся ў Гараднянскай сямігадовай школе № 2. Перад экзаменамі захварэў, а пасля выздараўлення пачаў працаваць кладаўшчыком запасных частак у Гараднянскай МТС (машынна-трактарнай станцыі), дзе і захапіла яго пачатая фашысцкай Германіяй вайна. Да акупацыі раёна Барыс Калач рамантаваў армейскія аўтамабілі. Не паспеўшы эвакуіравацца, застаўся на тэрыторыі свайго раёна. У адпаведнасці ж з афіцыйнай біяграфіяй, у 1939 годзе скончыў сямігодку, а ў 1940 – школу фабрычна-заводскага навучання пры Гомельскім паравозарамонтным заводзе. Атрымаўшы спецыяльнасць токара па металу, працаваў на гэтым жа заводзе. У красавіку 1941 года вярнуўся ў родную вобласць працаваць токарам-інструментальшчыкам Чарнігаўскай МТС.

У сакавіку 1942 года Барыс добраахвотна пайшоў у Чарнігаўскі партызанскі атрад, які потым перарос у буйное і магутнае Чарнігаўска-Валынскае партызанскае злучэнне, якім камандаваў першы сакратар Чарнігаўскага падпольнага абкома Кампартыі Украіны, будучы генерал-маёр, двойчы Герой Савецкага Саюза А. Ф. Фёдараў. Юнака прызначылі другім нумарам кулямётчыка. Ён прымаў актыўны ўдзел ва ўсіх баявых дзеяннях атрада, прыкрываў падрыўнікоў, якія дзейнічалі на Гомельскім чыгуначным вузле.

Калі атрад перарос у Чарнігаўскае злучэнне партызанскіх атрадаў, Калач аказаўся ў атрадзе імя М. А. Шчорса, украінскага Чапаева, ураджэнца той жа Чарнігаўскай вобласці, легендарнага героя Грамадзянскай вайны, камандзіра праслаўленага аб'яднанага партызанскага атрада, затым дывізіі Чырвонай Арміі. У красавіку 1943 года адважнага партызана прызначылі камандзірам спачатку аддзялення, а затым – дыверсійнага ўзвода.

Нарыс «Таварыш Ілля Прарок» у мастацкай форме малюе партызанскую дзейнасць Барыса Калача. Яркім сюжэтным момантам тут з'яўляецца замалёўка аб тым, як камандзір партызанскага атрада Р. Стральцоў і яго штаб накіравалі Барыса Філіпавіча з партызанам Канканянам падарваць мост, што знаходзіўся недалёка ад стаянкі атрада і праз які павінны прайсці фашысты, каб напасці на атрад. Мост падарваць не паспелі, бо гітлераўцы забілі каня пад Барысам Калачом і цяжка паранілі яго самога. У час перастрэлкі з ворагамі Канканян уцёк у атрад і сказаў, што Калач забіты. Камандзір загадаў арыштаваць Канканяна і паспяшаўся з партызанамі на дапамогу Барысу Філіпавічу. Неўзабаве яны вярнуліся з перамогай і прынеслі на плашч-палатцы Барыса Калача. Калі ён апрытомнеў, «два партызаны ўштурхоўваюць у святліцу (сялянскай хаты) звязанага, уздрыгваючага і бледнага Канканяна.

Што з ім рабіць?

– Ціха! – злосна шэпча Стральцоў.

З мінуту ён думае... Суровы няпісаны партызанскі закон. Цяжка аддаць загад...

Стральцоў пераводзіць погляд на Мерзава, з яго – на Ярыгіна. Усё зразумела.

– Расстраляць! – ціха, але жорстка прамаўляе Стральцоў.

– Пачакай... Не трэба, Раман. Няхай жыве!..

Гэта кажа Калач. Ён з цяжкасцю прыпадымаецца над ложкам.

Усе са здзіўленнем глядзяць на Барыса.

– Ён яшчэ малады... Яшчэ паваюе – навучыцца. Няхай жыве... – паўтарае Калач...»

Улетку і восенню 1943 года ўзвод Барыса Калача падрываў варожыя эшалоны на чыгуначным участку Ковель – Сарны. Толькі адзін яго ўзвод падарваў 54 эшалоны з баявой тэхнікай, гаручым і жывой сілай ворага. Асабіста Барыс Філіпавіч падарваў 12 эшалонаў. Быў першы раз паранены. Партызаны яго ўзвода паспяхова дзейнічалі ў гэтым раёне да прыходу часцей Чырвонай Арміі.

Пасля гэтага Калач быў накіраваны ў школу асобага прызначэння пры Украінскім штабе партызанскага руху. 24 ліпеня 1944 года Барыс Філіпавіч у складзе добраабучанай дыверсійнай групы асобага прызначэння быў высаджаны ў далёкім тыле ворага – у гарах Славакіі, дзе група разгарнула дыверсійную дзейнасць супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яна вельмі хутка перарасла ў партызанскі атрад «За Радзіму», у якім Барыс Калач зноў узначаліў узвод падрыўнікоў. У лістападзе 1944 года мужны патрыёт быў другі раз паранены, на гэты раз цяжка, і адпраўлены ў шпіталь, адкуль выпісаўся толькі перад самай Перамогай.

Пра яго мужнасць, знаходлівасць, любоў да Радзімы гавораць баявыя справы, знішчаныя ім варожыя эшалоны.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 2 мая 1945 года за ўзорнае выкананне заданняў камандавання ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, праяўленыя пры гэтым мужнасць і геразм і за асаблівыя заслугі ў развіцці партызанскага руху Барысу Філіпавічу Калачу прысвоена званне Героя Савецкага Союза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка» (№ 7549).

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны Барыс Філіпавіч вярнуўся да мірнай працы. У 1950 годзе скончыў гістарычны факультэт Гомельскага педагагічнага інстытута і працаваў спачатку дырэктарам Буда-Кашалёўскай сярэдняй школы, затым інспектарам Гомельскага абласнога аддзела адукацыі, завучам Гомельскай сярэдняй школы-інтэрната, дырэктарам Гомельскай СШ № 6 і, нарэшце, з 1970 па 1983 год – дырэктарам Гомельскай сярэдняй школы № 2.

12 чэрвеня 1950 года дырэкцыя педінстытута выдала свайму выпускніку выдатную характарыстыку, якая заканчвалася такімі словамі: «Валодае арганізатарскімі здольнасцямі, можа быць выкарыстаны ў якасці дырэктара СШ. Маральна ўстойлівы, палітычна развіты, ідэалагічна вытрыманы. Справе партыі Леніна-Сталіна адданы».

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, «За службу Радзіме», медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» I ступені, замежнымі ўзнагародамі.

У савецкі перыяд з'яўляўся ганаровым грамадзянінам славацкага горада Медзілаборцэ.

Барыс Філіпавіч быў на рэдкасць высакародным, сапраўдным вялікім гуманістам. Аб гэтым яскрава сведчыць урывак з дакументальнага нарыса таксама былога партызана-падрыўніка Уладзіміра Паўлава, знаёмага з Калачом яшчэ з 1942 года.

25 снежня 1955 года быў выпушчаны спецыяльны бюлетэнь пад рэдакцыяй І. Ф. Харламава «За педагогические кадры», прысвечаны 25-гадоваму юбілею Гомельскага дзяржаўнага педагаічнага інстытута імя В. П. Чкалава. У гэтым выпуску змешчана і невялікая нататка інспектара Гомельскага абласнога аддзела народнай адукацыі, Героя Савецкага Саюза Барыса Калача «Бліжэй да практыкі»: «З вялікай цеплынёй успамінаю я час вучобы ў інстытуце. Тут атрымалі мы неабходныя агульнатэарэтычныя і спецыяльныя веды, якія забяспечылі нам магчымасць творча працаваць на карысць любімай Радзімы.

У дзень юбілею я пажадаў бы свайму інстытуту з кожным годам паляпшаць спецыяльную педагагічную падрыхтоўку, лепш арганізоўваць педпрактыку студэнтаў, больш грунтоўна знаёміць іх з пастаноўкай вучэбна-выхаваўчай работы ў школе.

Варта пажадаць інстытуту ўзмацніць эксперыментальную працу ў лабараторыях і майстэрнях, каб лепш падрыхтаваць будучых настаўнікаў да правядзення ў школе практычных заняткаў з навучэнцамі».

У музеі СШ № 2 Гомеля сабрана шмат фотаздымкаў і іншых матэрыялаў, частка з якіх прадстаўлена ў музейнай экспазіцыі. У горадзе, бадай, няма іншай такой школы, якую б скончыла ці ў якой працавала б такая вялікая колькасць Герояў Савецкага Саюза і Сацыялістычнай працы. На самім будынку гэтай установы адукацыі змешчана мемарыяльная дошка ў гонар Барыса Калача. Ёсць дошка і на доме № 7 па вуліцы імя Катуніна, дзе Барыс Філіпавіч жыў у апошні перыяд свайго жыцця.

Канстанцін УСОВІЧ,
загадчык музея-лабараторыі Ф. Скарыны.

Фота з фондаў музея СШ № 2.